НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь, твой народ дачакаецца Залацістага, яснага дня!*
*М. Багдановіч.*

№ 15 (127), ЛІСТАПАД 2011 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

**ПОГЛЯД РЭДАКТАРА**

## КАДРАВЫЯ ПЕРАТАСОЎКІ СТАРОЙ НАМЕНКЛАТУРЫ

**Для большасці шумілінцаў стала нечаканым прызначэнне новага кіраўніка раёна. Чуткі пра адстаўку старшыні райвыканкама Вальдэмара Падляшчука хадзілі даўно, але ніхто не ведаў, адкуль прывязуць новага начальніка. На 16-й нечарговай сесіі Савета дэпутатаў новым кіраўніком раённай вертыкалі на Шумілінщчыне прызначаны Уладзімір Куранны, які дагэтуль працаваў першым наместнікам старшыні Лепельскага райвыканкама.**

Безумоўна, прызначэнне новага кіраўніка раёна – гэта найбольш важная падзея, якая адбылася на Шумілінщчыне. Бо апошнім часам наш раён апынуўся ў стане глыбокага эканамічнага крызісу. Раённы бюджэт цалкам трымаецца на датацыях, а па ўзроўню заработнай платы шумілінскія працаўнікі займаюць 20-е месца ў вобласці. З 20-ці прагнозных паказчыкаў у раёне не выкананы 17.

Разам з тым на сесіі райсавета абласны начальнік па кадравай рабоце Уладзімір Севярын ухваліў дзейнасць былога кіраўніка райвыканкама Вальдэмара Падляшчука, які займаў пасаду 11 гадоў. Менавіта пад яго кіраўніцтвам было пабудавана 8 аграгарадкоў, праведзена газіфікацыя Шуміліна, Обалі і іншых населеных пунктаў, створана 75 прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці. Мабыць кадравік з вобласці асабліва не ўнікаў, як метады кіраўніцтва Падляшчука паўплывалі на сітуацыю з кадрамі ў нашым раёне. Да прыкладу, каля 70% спецыялістаў сельскай гаспадаркі з вышэйшай адукацыяй разбегліся ў пошуках лепшай долі. Кадравы голад зараз востра адчуваецца на кожным прадпрыемстве – тэрмінова патрабуюцца па 8-12 спецыялістаў у розных галінах вытворчасці, асабліва ў жывёлагадоўлі і раслінаводстве. З гэтай інфармацыяй можа азнаёміцца кожны на сайце Шумілінскага райвыканкама

Як вядома, самаўладнае права прызначэння на вышэйшыя дзяржаўныя пасады належыць толькі аднаму чалавеку – кіраўніку краіны Аляксандру Лукашэнку. Менавіта яму непасрэдна падпарадкоўваецца гэтак званая "вертыкаль улады". Праўда, "вертыкальшчыкаў" яшчэ неабходна зацвердзіць на сесіі, але гэта працэдура звычайна адбываецца аўтаматычна. Вось і на гэты раз, калі старшыня аблвыканкама Аляксандр Касінец прапанаваў на разгляд сесіі новую кандыдатуру, дык шумілінскія дэпутаты прагаласавалі "як трэба". 11 лістапада на нечарговай сесіі райсавета рашэнне ад зацверджанні Уладзіміра Кураннога на пасадзе старшыні Шумілінскага райвыканкама "народныя" выбраннікі прынялі адзінагалосна.

У сваёй прамове кіраўнік вобласці Аляксандр Касінец заўважыў, што наш рэгіён павінен выглядаць больш дастойна. На яго думку, Шуміліна – гэта практычна горад-спадарожнік Віцебска, уяздныя вароты абласнога цэнтра, а таму і яго жыхары павінны жыць годна. Пара пераходзіць на такую сістэму, дзе датацыі павінны быць мінімальнымі. А дзеля гэтага трэба навучыцца самім зарабляць грошы. У рэгіёна выгаднае геапалітычнае становішча, аднак насамрэч тут няма ні прыдарожнага сервісу, ні рэкламы, ні іншых відаў паслуг, якія б змаглі прыносіць прыбытак. Слаба наладжана сістэма гандлю па рэалізацыі прадукцыі, выробленай у вобласці, пры гэтым недапушчальна высокая доля імпарту. Каб мець валюту і абаротныя фонды для развіцця эканомікі раёна, трэба амаль удвая павялічыць экспартныя пастаўкі.

У сваю чаргу новы кіраўнік Шумілінщчыны Уладзімір Куранны падзякаваў усіх за аказаны давер і абяцаў выканаць усе задачы па выкананню росту параметраў, даведзеных зверху. Апроч таго, ён заявіў, што выведзе наш дэпрэсіўны рэгіён на лідзіруючыя пазіцыі не толькі ў вобласці, але і ў рэспубліцы. Адукацыя ў Куранного ёсць: у гэтым годзе скончыў Акадэмію кіравання. А вопыт набыў у Лепельскім раёне, дзе па словах абласнога кадравіка У. Севярына была "дасягнута станоўчая дынаміка ў развіцці сельскай гаспадаркі".

Як бы там ні было, але цёплы прыём, аказаны дэпутатамі кішэннай прэзыдэнцкай вертыкалі, зусім не азначае, што насельніцтва раёна адзінадушна пагадзілася з рашэннем аблвыканкама. Відавочна, што для большасці жыхароў падзея кадравай перамены раённага наменклатуршчыка засталася проста незаўважанай. Аднак далёка не ўсе згодны з такімі кадравымі перастаноўкамі. У прыватных размовах людзі выказваюць незадаволенасць тым, што маўляў, калі нам перастануць навязваць зверху кіраўнікоў і дэпутатаў з іншых раёнаў і гарадоў? Кожны раз пасылаюць "варагаў" з чужога боку, у той час, як на Шумілінщчыне ёсць нямала дастойных кандыдатур. Толькі такім людзям, якія выраслі на гэтай зямлі, будуць зразумелыя ўсе набалелыя праблемы, з якімі спраўляюцца штодзённа ўласнымі сіламі. А хіба сам Лукашэнка не казаў аб перавагах мажарытарнай сістэмы, калі выбіраюць прадстаўнікоў улады з таго рэгіёну, дзе людзі іх добра ведаюць? А тут атрымліваецца, што новы вертыкальшчык, можа дзейнічаць па прынцыпу: "для навядзення парадку ўсе метады добрыя". Хто яго ведае, можа накамандуецца ўволю, выкарыстае працоўны люд на поўніцу ў мэтах кар'ернага росту, а затым яго забяруць у другі горад на павышэнне.

Колькі б Лукашэнка і яго атачэнне не пераконвалі людзей у сваёй палітыцы: "мае кадры вырашаюць усё" – сістэма вертыкалі ніяк не спрацоўвае на карысць народа. Цяперашняя палітыка аўтакратычнага ( а можа ўжо і таталітарнага) рэжыму скіравана ў першую чаргу на ўтрыманне любой цаной асабістай улады аднаго чалавека. Таму найчасцей у гэтым выпадку практычна не ўлічваецца адукаванасць, прафесіяналізм, кампетэнтнасць, павага да законаў, культурны узровень і маральныя якасці службовай асобы. Галоўны паказчык "бацькавага" вылучэнца – адданасць вярхоўнаму правіцелю. Тыя чыноўнікі, якія на справе не даказваюць вернасць правадыру, адразу ж трапляюць у спіс "ворагаў народу".Такая жалезная логіка любой аўтарытарнай сістэмы – кадры павінны тасавацца. Пры гэтым народ пра кіраўнікоў нічога не павінен ведаць. Ніякай канкурэнцыі на альтэрнатыўных выбарах, каб не дапусціць да ўлады прагрэсіўных палітыкаў-рэфарматараў. У рэшце рэшт банальнае ператрасанне кадраў старой разбухшай бюракратыі прывядзе да разбурэння самой сістэмы ўлады, як тое здарылася ў СССР.

**Аляксандр Шчамлёў.**

**БУДАЎНІЦТВА**

## Новабудоўля гаспадарцы не па кішэні

**Працягваецца будаўніцтва новай фермы ў Амбросавічах. Аднак з прычыны затрымкі фінансавання тэмп будаўнічых работ апошнім часам знізіўся. На завяршэнне будоўлі з улікам росту цэн трэба яшчэ выдаткаваць чатыры мільярды рублёў.**

Сёлета на новабудоўлі было асвоена 8,9 мільярдаў рублёў, выдаткаваных па лініі Белаграпрамбанка крэдытных сродкаў. Сучасны жывёлагадоўчы комплекс разлічаны на 600 галоў каровінага статка. Пабудавана два кароўнікі і малочна-даільны блок, дзе будзе змантаравана сучасная даільная ўстаноўка беларуска-аўстрыйскай вытворчасці. Гэта абсталяванне дазволіць адначасова даіць сорак кароў. У даільнай зале будуць устаноўлены кампутары, якія дапамогуць кантраляваць працэс дойкі, колькасць і якасць малака. Збудаваны цэх для сухастойных кароў, дзве сенажныя траншэі, ідуць работы па ўцяпленню даху.

Да пачатку зімы плануюць завяршыць мантаж жалезабетонных канструкцый усіх жывёлагадоўчых памяшканняў: такая задача пастаўлена перад будаўнікамі, якія задзейнічаны на ўзвядзенні новай жывёлагадоўчай фермы. Гэта пры ўсім тым, калі будуць пералічаны грошы падрадным арганізацыям. Вытворчыя будынкі ўзводзяць шумілінскія будаўнікі, а складанае абсталяванне манціруюць спецыялісты з Мінску. Па ўсяму відаць, што фінансавыя праблемы істотна перашкаджаюць планаваму ходу работ. У гаспадарцы ААТ "Прыазёрны мір" сваіх грошай на будаўніцтва такого складанага і дарагога комплекса няма, на свае сілы не разлічваюць – тут спадзяюцца на дапамогу дзяржавы. У калгаснікаў нават няма грошай на закупку новай тэхнікі для фермы – патрэбна яшчэ пяць мільярдаў рублёў. Усяго ж, паводле падлікаў, ферма абыдзецца недзе ў 18 мільярдаў рублёў. А гэта азначае, што ў праект будуць унесены карэкціроўкі і работы зацягнуцца. Вось каб толькі новабудоўля не ператварылся ў доўгабуд.

**Алесь Шумскі.**

## АБ'ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвес-ткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

**КНІГА СКАРГАЎ**

## АДГАВОРКІ НЕ ПРЫМАЮЦЦА

**Другі год запар жыхары аграгарадка Амбросавічы, якія пражываюць па вуліцах Кааператыўная і Зялёная, не могуць вызваць спецыялістаў па тэхнічнаму абслугоўванню газавых катлоў. Катлы знаходзяцца на балансе камунгасу, аднак яго кіраўніцтва не спяшаецца выконваць свае абавязкі, якія прапісаны ў дагаворы.**

Паводле дагаворных абавязацельстваў на пачатку ацяпляльнага сезону Шумілінскі камунгас павінен зрабіць тэхнічнае абслугоўванне воданагравальных катлоў, якія працуюць на газе. Сутнасць справы ў тым, што сучасныя ацяпляльныя апараты два гады таму ўстанавіла сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю "Альфа-Калор". Верагодна, што ў Шумілінскім камунгасе сваіх спецыялістаў няма, таму тэхнічнае абслугоўванне можа зрабіць толькі філіял "Альфа-Калор-Віцебск". Тэхнічнае абслугоўванне павінна рабіцца адзін раз у год да 20 верасня па заяўках абанентаў. Жыхары дамоў па вуліцах Зялёная і Кааператыўная заяўку падавалі, але ўзнікла яшчэ адна акалічнасць. Філіял "Альфа-Калор" выставіў кошты на даныя віды работ. Работы з прамыўкай саставілі 140 тысяч рублёў, транспартныя выдаткі – 720 рублёў за адзін кіламетр (гэта па цэнах за верасень). Хто будзе плаціць? Дырэктар Шумілінскага камунгасу Валерый Коўзан заверыў сельскіх жыхароў, што за ўсе работы віцебскіх спецыялістаў заплаціць раённае прадпрыемства. Згодна з пунктамі дагавора жыхары дамоў падалі калектыўны зварот у камунгас. Але чамусьці адтуль нават пісьмовага адказу не дачакаліся, акрамя абяцанкаў па тэлефоне. На двары ўжо канец лістапада, а абяцаныя кіраўніцтвам камунгасу работы па тэхнічнаму абслугоўванню газавых катлоў у Амбросавічах так і распачаліся. А пакуль паразумення з мясцовымі камунальнікамі няма, то вяскоўцы вырашылі падаваць скаргу ў больш высокія інстанцыі.

**Уладзімір Амбросаў.**

## "СВІТАНАК" У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу "Пэрыёдыка" для далейшага выкарыстання яшчэ да з'яўлення газеты на паперы.**

У ЦЭНТРЫ УВАГІ

# Прэтэнзіі вяскоўцаў да ўлады

**Сельсавет з'яўляецца самым наближаным да людзей органам мясцовай і прадстаўнічай улады. Адной з форм работы органаў мясцовага самакіравання з'яўляюцца сустрэчы насельніцтва з інфармацыйнымі групамі работнікаў райвыканкама. У ходзе мерапрыемства на тэрыторыі Дабейскага сельсавета раённым чыноўнікам зноў давodзілася выслухоўваць нямала нараканняў ад вяскоўцаў у адрас розных службаў.**

Што хвалюе сёння вяскоўцаў? Якія пытанні яны не ў стане вырашаць самі і таму звяртаюцца да прадстаўнікоў улады? Як высветлілася падчас сустрэч насельніцтва з чыноўнікамі ў 29-ці вёсках, значна павялічылася колькасць зваротаў, якія задаволіць у кароткі тэрмін не ўяўляецца магчымым. На вырашэнне большасці пытанняў патрабуецца шмат часу, на іншыя просьбы людзям даюцца толькі вусныя адказы. У кожным канкрэтным выпадку вырашэнне праблемы даручаецца той ці іншай адказнай асобе.

Вось і на прэтэнзіі жыхароў Дабейскага сельсавета аб паляпшэнні работы аўтамагазінаў былі даны толькі тлумачэнні. Работнікі райспажыўтаварыства абяцалі больш разнастайны і якасны асартымент тавараў. У сельвыканкаме кожны тыдзень будуць удакладняць графік работы аўталавак.

Акрамя таго, кіраўнікамі адпаведных службаў распрацаваны тэрміны завяршэння работ. У прыватнасці, да канца лістапада будзе забяспечана бесперабойнае функцыянаванне вулічнага асвятлення ў аграгарадку Амбросавічы па вуліцах Кааператыўнай і Зялёнай. У вёску Ляжні будзе накіраваны перасоўны комплексны пункт з прадстаўленнем паслуг цырульніка. Рамонт дарогі ў вёскі Лялюгі адкладзены да другога квартала 2012 года. Наступным этапам у 2012 годзе пачнуцца работы па рамонце даху сельскага клуба ў вёсцы Дабея, але толькі ў тым выпадку, калі будуць знойдзены грошы. Тыя ж рамонтныя работы, што вядуцца ў пад'ездах дома №2 у вёсцы Прыазерная па вуліцы Маладзёжнай, будуць узяты пад кантроль райвыканкама.

Аналіз разгляду зваротаў паказвае, што ўсё часцей выкананне работ адпаведных службаў вядзецца марудна з-за недастатковага фінансавання. Варта адзначыць, што і самі сельсаветы не праяўляюць ініцыятывы ў пошуках новых крыніц паступленняў сродкаў у даходную частку бюджэту.

Наогул, ці ёсць карысць ад гэтых бясконцых раз'ездаў па раёну гэтак званых інфармацыйна-прапагандысцкіх груп? У эпоху сучасных камунікацый кожны грамадзянін можа цесна кантактаваць з органамі ўлады і без нудных пасядзелак розных начальнікаў з бабулькамі 26-ці аддаленых вёсак. Так як і ўлада можа аператыўна рэагаваць на звароты жыхароў, калі таго пажадае. Устанаўленне лакальнай электроннай сувязі ва ўсіх органах мясцовага самакіравання ў некалькі разоў павялічыла б аператыўнасць. Што надзвычай важна, паколькі цяпер мясцовым службам і арганізацыям загадана працаваць з грамадзянамі па заяўляльнаму прынцыпу "адно акно". Але як паказала практыка, адзінкавыя звароты грамадзян часта перарастаюць у доўгую перапіску з чыноўнікамі.

**Алесь Прыбярэжны.**

ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# УСЁ ПАЧЫНАЛАСЯ З НАРОДНАЙ СЛАВЫ

**Работнікі музейнай справы раёна сёлета з гонарам адзначаюць знамянальную дату. 26 лістапада споўнілася 25 год са дня адкрыцця Шумілінскага гісторыка-краязнаўчага музея.**

А пачыналася гісторыя ўстановы яшчэ з 28 траўня 1984 года, калі паводле рашэння Міністэрства культуры аб адкрыцці раённага музея народнай славы пачалася праца па збору экспанатаў, матэрыялаў і калекцый. Пад гэты праект быў выдзелены адрамантаваны будынак.

На пачатку працавалі дзве залы, дзе былі размешчаны экспазіцыі, якія былі прысвечаны працоўнаму і ваеннаму подзвігу нашых землякоў. У асноўным наведвальнікам былі прадстаўлены тэмы экспазіцый савецкага перыяду. У адной зале сабралі матэрыялы, фотаздымкі, асабістыя рэчы, якія расказвалі пра даваенае жыццё і будаўніцтва сацыялізму ў раёне. Музейныя экспанаты, сабраныя ў другой зале, распавядалі аб падзеях вайны з нямецка-фашысцкімі акупантамі (зараджэнне і развіццё партызанскага і падпольнага руху ў раёне).

У 1993 годзе пасля адкрыцця трэцяй экспазіцыйнай залы, прысвечанай пасляваеннаму аднаўленню шумілінскага краю, музей народнай славы перайменавалі ў гісторыка-краязнаўчы музей. Першым кіраўніком музея працавала Людміла Голубева. Яна першай пачала збор тых матэрыялаў, якія затым склалі асноўны фонд музея.

На сённяшні дзень асноўны фонд музея налічвае 11 тысяч экспанатаў. Значнае месца ў экспазіцыі займаюць калекцыі фотаздымкаў і дакументаў вайны, зброя партызан, асабістыя рэчы герояў-землякоў – П. Акуцыёнка, М. Ласкунова, калекцыі карцін мастакоў Я. Ушала, У. Іванова, У Белавусава, прадметы этнаграфіі і быту сялян 19-20 стагоддзя. Ёсць археалагічныя знаходкі: парэшткі мамантa, знойдзеныя на беразе Дзвіны і іншыя.

Музей праводзіць аглядныя і тэматычныя экскурсіі, урокі гісторыі, ведаў, лекцыі па краязнаўстве, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, мастакамі, паэтамі,прадастаўляе кансультацыйную і метадычную дапамогу па падрыхтоўцы адкрытых урокаў у школах.

Самымі яркімі і запамінальнымі сёлета былі выстаўкі калекцыйна-сувенірнай зброі, выстаўка матылькоў, марскіх ракавін і каралаў.

**Алесь Прыбярэжны.**

ПРАЦОЎНЫЯ РЭЗЕРВЫ

# ПРАЦОЎНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ ПАПОЎНІЛІ МАЛАДЫМІ КАДРАМІ

**Адміністрацыя раёна правяла традыцыйную сустрэчу з маладымі кадрамі –выпускнікамі вышэйшых, сярэднеспецыяльных устаноў, якія па размеркаванню прыбылі ў на Шумілiншчыну. Сёлета парадзелыя шэрагі працоўных калектываў папоўнілі 89 маладых спецыялістаў. Ці надоўга яны ўтрымаюцца тут, у нашым дэпрэсіўным рэгіёне?**

Так, несуменнна, паспяховае развіццё нашага раёна ў бліжэйшым будучым залежыць ад моладзі, ад яе ініцыятывы і актыўнасці, плённай дзейнасці і працоўных дасягненняў. Менавіта гэтыя людзі ўжо зараз павінны прымаць адказныя дзеянні, ад якіх залежыць, у якім накірунку будзе развівацца наш рэгіён.

Да працоўных абавязкаў упершыню прыступілі 89 чалавек. Многія з іх мала ведаюць наш край. Таму ёсць традыцыя раённых кіраўнікоў раён штогод арганізоўваць сустрэчы з маладымі спецыялістамі, каб даць ім магчымасць больш даведацца, пазнаёміцца з жыццём раёна.

Перад прысутнымі выступіў нядаўна прызначаны на пасаду старшыня райвыканкама Уладзімір Куранны. Генадзь Пятровіч заклікаў маладых смялей брацца за справу, працаваць сумленна і не баяцца памылак у рабоце. Па яго меркаванню, дзяржава дапамагла выпускнікам атрымаць адукацыю і стварыла першае рабочае месца. Таму і спадзяецца на адпаведную аддачу ў творчасці спецыяліста. Да таго ж не пашкодзіць, каб маладыя, адпрацаваўшы вызначаны тэрмін засталіся тут, прыжыліся і пусцілі карані.

На сустрэчы з моладдзю прадстаўнікі розных арганізацый расказалі маладым аб перспектывах працоўнай дзейнасці, накірунках маладзёжнай палітыкі, праінфармавалі пра льготныя крэдыты для спецыялістаў. Прынамсі, маладыя спецыялісты не выйшлі на дыялог, які прапаноўвалі ім, але трэба спадзявацца, карысную інфармацыю яны для сябе атрымалі спаўна. Зрэшты, двое маладых людзей усё ж такі задалі пытанні пра тое, як атрымаць матэрыяльную дапамогу і пабудаваць уласнае жыллё. Падчас мерапрыемства маладым спецыялістам уручылі буклеты "Шумілінскі раён".

**С. Горкі.**

ВАЛАНЦЁРСКІ РУХ

# АКЦЫЯ Ў АБАРОНУ ЖЫЦЦЯ

**У СШ №2 школьнікі не толькі самі навучаюцца правілам бяспечнай жыццядзейнасці, але і дапамагаюць другім. Юныя выратавальнікі ўдзельнічаюць у мерапрыемствах супрацьпажарнай тэматыкі. Нядаўна дзеці з гуртка "Юны выратавальнік" правялі ў райцэнтры акцыю.**

Апранутыя ў пажарную ўніформу, актывісты гуртка распаўсюджвалі спецыяльна падрыхтаваныя ўлёткі ў найбольш людных месцах Шуміліна. Мінакам на вуліцах, пасажырам на вакзалах, пакупнікам у магазінах раздавалі друкаваныя матэрыялы з назвамі "Беражыце жыццё сваіх дзяцей", "Не спальвайце сваё жыццё".

Супрацоўнікі райаддзела па надзвычайных сітуацыях удзячны юным валанцёрам за карысную грамадскую працу. Сумесная дзейнасць не праходзіць дарма. Паводле статыстычных дадзеных, асноўная прычына пажару – неасцярожнае абыходжанне з агнём. Прычым людзі нярэдка гінуць з-за несцярожнасці пры курэнні, знаходзячыся ў нецвярозым стане. Дарэчы, у нашым раёне сёлета адбылося 35 пажараў (на 10 менш, чым у мінулым годзе), але дзякуй богу, ніхто не загінуў. Магчыма па справе супрацьпажарнай бяспекі зрабілі свой невялікі уклад валанцёрскай працай і юныя выратавальнікі.

**У. Амбросаў.**

ЭКАНОМІКА РАЁНА

# МЕЛІЯРАТАРЫ ЗДАЮЦЬ ПАЗІЦЫІ

**Сёлета работнікі прадпрыемства меліярацыйных сістэм адчуваюць няўпэўненасць у заўтрашнім дні. Калі да жніўня гэтага года працавалі без збояў, то ў наступныя месяцы пачаліся прастоі. Апошнім разам знялі выгадны падрад на меліярацыйныя работы ў ААТ "АграБаравінка" на даволі ўнушальную суму – 780 мільёнаў рублёў. Некалькі работнікаў звольнілася з-за нізкіх заробкаў.**

Гадоў дзесяць таму Шумілінскае ПМС было лідэрам сярод вядучых прадпрыемстваў раёна. Калектыў на працягу многіх гадоў выконваў даведзеныя аб'ёмы падрадных работ, заказчыкаў хапала, добры заробак меліяратараў адлюстроўваў дабрабыт прадпрыемства.

Але часы змяніліся. Не сакрэт, што каб сёння стабільна працаваць і мець даход, трэба пашыраць спектр паслуг, накірункі і віды работ.

Увогуле, каму зараз патрэбна выкарыстанне меліяраваных зямель? Як вядома Шумілінщына – край азёр і балот. Меліярацыя забалочаных зямель – гэта вяртанне іх у абарот і магчымасць атрымання дадатковай сельскагаспадарчай прадукцыі. Раней дзяржава лічыла асушэнне балот важнай справай і не шкадавала грошай з бюджэту на меліяратыўныя работы. Аднак затым па вядомых прычынах калгасы і саўгасы скарацілі плошчу сельскагаспадарчых угоддзяў і цяпер меліяраваныя землі не спяшаюцца ўводзіць у абарот. А калі і выкарыстоўваюць, то яўна неэфектыўна. Ствараецца ўражанне, што тыя прыгодныя для эксплуатацыі землі і нядаўна ўведзеныя ў эксплуатацыю аб'екты патрэбны больш самім меліяратарам, чым гаспадаркам. Тым больш, што планы даводзяцца дзяржавай зверху без уліку патрэб з боку заказчыкаў. Што і падцверджана лічбамі: у бягучым годзе Шумілінскаму ПМС паводле плана патрэбна было асвоіць 5,7 мільярдаў рублёў. Аднак за дзевяць месяцаў удалося выканаць работ на 3мільярды 921 мільён рублёў. А як яшчэ іх можна было асвоіць, калі на аб'ектах няма каму працаваць: вялікая цякучка кадраў, асабліва не хапае інжынераў і тэхнікаў. На маладых спецыялістаў не спадзяюцца: усе, каго на ПМС прысылаюць пасля акадэміі або каледжа – звальняюцца праз два гады. З прыкладу, аднаго маладога майстра забралі ў войска, а з пасады прараба адна жанчына неўзабаве выйдзе на пенсію. Пры ўсім тым, што сярэдняя зарплата таксама невысокая: за дзевяць месяцаў склала 1мільён 350 тысяч рублёў. Пра тэхніку і казаць няма чаго. Бывалыя работнікі помняць часы, калі на аб'ектах былі задзейнічаны звыш дзесятка экскаватараў, а зараз працуюць усяго два.

Каб забяспечыць працай калектыў, трэба мяняць падыходы да справы. Ёсць раёны, дзе меліяратары значна пашырылі спектр паслуг і таму нядрэнна зарабляюць. Па розных відах работ створаны брыгады. Супрацоўнікі ПМС працягваюць пракладваюць водаправоды, вывозяць на палі арганіку, рамантуюць дарогі, узводзяць жылыя дамы. А наша Шумілінскае ПМС пакуль што існуе па прынцыпу "жыць як набяжыць". Больш- менш варушыцца толькі адна брыгада дрэнажнікаў, у якой можна зарабіць да трох мільёнаў рублёў. Якія перспектывы чакаюць шумілінскіх меліяратараў на будучы год? Начальства абнадзейвае, што ў наступным 2012 годзе застануца некалькі аб'ектаў у мясцовых калгасах для рэканструкцыі і абслугоўвання.

**Я. Вайтовіч.**

ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# КРЕМЛЬ-МИНСК: ПИТОН ДАЛ СКИДКУ КРОЛИКУ

ДАВНО АЛЕКСАНДР ЛУКАШЕНКО НЕ ПОЖИНАЛ В МОСКВЕ ТАКОЙ ТРИУМФ. ПОЛНА КОРОБУШКА ПРЯНИКОВ: И ГАЗ ПО 165 ДОЛЛАРОВ С ЯНВАРЯ (СЕЙЧАС КОНТРАКТНАЯ ЦЕНА В РАЙОНЕ 280), И РЕСТРУКТУРИЗАЦИЯ ДОЛГА ЗА ГОЛУБОЕ ТОПЛИВО, И ЩЕДРЕЙШИЙ КРЕДИТ НА БЕЛОРУССКИЙ «МИРНЫЙ АТОМ»…

Если отбросить выспреннюю риторику, которой ознаменовалось заседание Высшего госсовета союзного государства 25 ноября (вербальные рецидивы «братской интеграции»), то в сухом остатке бесспорный медицинский факт: белорусским властям опять чертовски подфартило. Как минимум на год финансовые дыры — за счет новых энергоскидок, продажи остатка «Белтрансгаза» и прочих бонусов — удастся заткнуть.

Другое дело, отмечают независимые белорусские эксперты, что Москва действует по классической схеме сыра в мышеловке. Она проплачивает втягивание Беларуси в свои интеграционные проекты с выходом на Евразийский союз. Что чревато консервацией отсталой экономической модели, постепенной утратой суверенитета, окончательным выпадением синеокой республики из европейского контекста.

### Тактический выигрыш, стратегический тупик

«Идея восточного союза имеет лишь временные выгоды для Беларуси», — отметил в комментарии для Naviny.by бывший руководитель Национального банка Станислав Богданкевич.

Эти выгоды, по его мнению, почти сойдут на нет со вступлением России в ВТО. Даже при относительно дешевом газе многим белорусским производителям может оказаться не по плечу конкуренция с российскими: у нас все же весомее доля энергозатрат, выше НДС, в целом хуже бизнес-климат.

Москва же если и будет впредь помогать, то «во имя имперских амбиций», подчеркивает эксперт. Это опасно для независимости. Одним из ключевых этапов сдачи суверенитета может стать переход на российский рубль, считает Богданкевич, стоявший у колыбели белорусской валюты.

По словам ряда экономистов, дешевые энергоресурсы для еще совковой во многом белорусской экономики — как наркотик. Сегодня в кайф, но завтра жди ломки. Подсадка на российскую иглу может привести к полному отказу белорусского начальства от экономических реформ (в пристрастии к коим его и так трудно было заподозрить).

Кредит на строительство АЭС в Беларуси — Путин анонсировал до 10 миллиардов долларов — это, если по максимуму, даже больше, чем грезило белорусское начальство. Но противники «мирного атома» в стране, на которую пришелся основной удар Чернобыля, указывают и на то, что пресловутая энергетическая независимость, ради которой затеяна опасная стройка, — полная иллюзия.

Во-первых, кредиты положено отдавать с лихвой. Во-вторых, проект, оборудование, топливо, захоронение отходов — все это замыкается на Россию. Где вам тут отвязка от энергетической империи? Все как раз наоборот!

### Европа проиграла Беларусь навсегда?

Но пока польская «Газета выборча» констатирует: Евросоюз проигрывает Москве борьбу за Беларусь (и, возможно, Украину). Российские пряники оказались соблазнительнее эфемерных выгод «Восточного партнерства».

«Да, это сражение за Беларусь Брюсселем проиграно», — соглашается минский аналитик-международник Андрей Федоров. В комментарии для Naviny.by он подчеркнул: для Москвы синеокая республика оказалась важнее, чем для ЕС. Соответственно, добавим, Кремль и ввалил не жалеючи ресурсов на геополитическую перекупку. Означает ли это, что бывшая советская республика, традиционный стратегический плацдарм Кремля, после попыток флирта с Евросоюзом окончательно уходит в российское стойло?

«Не думаю, что речь идет о формальной инкорпорации, — полагает Андрей Федоров. — Пока Москве достаточно получить белорусское «фамильное серебро» и добиться полного следования Минска в фарватере российской политики».

Эксперт допускает, что тестом на лояльность может стать новый тур принуждения к признанию Абхазии и Южной Осетии. Собеседник также прогнозирует коллизии в рамках создания Евразийского союза, когда дело дойдет до конкретики, ущемляющей суверенитет.

Впрочем, по одной из реплик Лукашенко можно судить, что и переговоры 25 ноября протекали не вполне гладко: «Появились некоторые нюансы, мы договорились, что мы в состоянии в течение этого года эти проблемы обсудить и дополнительно в двустороннем формате на уровне правительств или президентов принять решение».

Аналитики дружно прогнозируют, что на какой-то стадии Минск упрется рогом. Вопрос, однако, в том, будет ли у белорусского руководства ресурс для сопротивления.

В глазах ряда экспертов Москва сейчас — как удав, который ведет свою фатальную игру с кроликом. Принципиально ли для участи последнего, что ему дали скидку на морковку, простите — на газ?

**Александр Класковский, Белапан.**

СПРАВА БЯЛЯЦКАГА

# СЬВЕТ ПРА ПРЫСУД БЯЛЯЦКАМУ

24 ЛІСТАПАДА СУДЗЬДЗЯ ПЕРШАМАЙСКАГА СУДУ МЕНСКУ СЯРГЕЙ БАНДАРЭНКА ПАКАРАЎ КІРАЎНІКА ПРАВААБАРОНЧАГА ЦЭНТРУ «ВЯСНА», ВІЦЭ-ПРЭЗЫДЭНТА МІЖНАРОДНАЙ ФЭДЭРАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА АЛЕСЯ БЯЛЯЦКАГА ЧАТЫРМА З ПАЛОВАЙ ГАДАМІ КАЛЁНІІ ЎЗМОЦНЕНАГА РЭЖЫМУ З КАНФІСКАЦЫЯЙ МАЁМАСЬЦІ.



Вынесены 24 лістапада прысуд праваабаронцу Алесю Бяляцкаму — чатыры з паловай гадаў пазбаўленьня волі з канфіскацыяй маёмасьці — працягваюць камэнтаваць у Беларусі і за мяжой. Гучаць новыя заявы з патрабаваньнем вызваліць праваабаронцу і зьняць зь яго абвінавачаньні.

Праваабаронцы, палітыкі і дыпламаты краінаў Эўразьвязу ды ЗША асудзілі вырак Бяляцкаму. Яны адзначаюць палітычную афарбоўку справы і тое, што віна Бяляцкага не было даказаная.

64 праваабарончыя арганізацыі з усяго сьвету выступілі зь лістом, у якім заклікаюць беларускія ўлады неадкладна зьняць усе абвінавачаньні супраць Алеся Бяляцкага і спыніць яго крымінальны перасьлед.

«Мы лічым, што Алесь Бяляцкі быў пакараны за свой законны ўдзел у справе абароны правоў чалавека ў Беларусі. Пазоў супраць Алеся Бяляцкага — гэта яшчэ адзін крок беларускіх уладаў супраць праваабаронцаў, каб паспрабаваць прымусіць замаўчаць галасы, якія нагадваюць пра абавязаньні Беларусі ў галіне правоў чалавека».

Справа Алеся Бяляцкага абавязкова прагучыць на наступным тыдні ў Познані, дзе пройдзе форум грамадзянскай супольнасьці «Ўсходняга партнэрства», кажа нацыянальны каардынатар форуму па Беларусі Ўлад Вялічка:

«На сустрэчу ў Познані прадстаўнік „Вясны“ запрошаны ў якасьці госьця. Запрашэньне даслалі яшчэ да таго, як стала вядома пра прысуд. І, канечне, тэма Алеся будзе гучаць на форуме. Ніякім чынам нельга прымаць такі вырак. Думаю, што грамадзянская супольнасьць — і эўрапейская, і беларуская — будзе вельмі жорстка рэагаваць на такое рашэньне».

Кандыдатуру Алеся Бяляцкага будуць прапаноўваць і на Нобэлеўскую прэмію міру, заявіў міністар замежных спраў Літвы Аўдронюс Ажубаліс. На думку літоўскага палітоляга Лаўруса Бялініса, гэта слушны крок: «Як мне падаецца, Бяляцкі робіцца своеасаблівым болем літоўскай палітычнай эліты. Таму што пэўная віна ў яго справе з боку Літвы ёсьць. І ад гэтага стаўленьне да яго вельмі спагадлівае. Зыходзячы з таго, што Бяляцкі, па сутнасьці, ёсьць палітычная ахвяра, палітычны вязень, якіх у гэтым рэгіёне няшмат, вылучэньне яго на такую прэмію мне падаецца дастаткова лягічным. Хоць, канечне, тут усё будзе залежаць ад таго, якія будуць іншыя кандыдаты».

Не абмінулі сваёй увагай справу Бяляцкага і дзяржаўныя беларускія СМІ. Іх працу назіральнікі ад Міжнароднай фэдэрацыі правоў чалавека і Ўсясьветнай арганізацыі супраць катаваньняў у супольнай заяве яшчэ два тыдні таму назвалі «абразьлівай кампаніяй паклёпу». Падобна, што за гэты час нічога не зьмянілася. Напрыклад, учора ў рэпартажы на тэлеканале СТВ гучала сцьвярджэньне пра нібыта велізарнае багацьце праваабаронцы, асабліва рынкавы кошт дзьвюх кватэраў, якія належаць Бяляцкаму. І ні слова пра тое, што другая кватэра набывалася выключна пад офіс «Вясны». Менавіта адсутнасьць афіцыйнай рэгістрацыі і прымусіла набываць кватэру для офісу на фізычную асобу. Пра гэта штодня гаварылася на працэсе Бяляцкага. Дзяржаўнае тэлебачаньне, аднак, пра гэта не згадала.

Сябра праўленьня Беларускай асацыяцыі журналістаў Яніна Мельнікава кажа, што ў асьвятленьні дзяржаўнымі мэдыямі працэсу Бяляцкага няма нічога дзіўнага альбо таго, чаго не назіралася бы раней: «Дзяржаўныя СМІ, альбо, хутчэй, дзяржаўныя сродкі прапаганды заўсёды карысталіся такімі „хітрыкамі“ і такімі нячэснымі, непрафэсійнымі з пункту гледжаньня журналісцкай этыкі прыёмамі, як сказаць „а“, не гаворачы „б“, даваць намёкі і нібыта факты, якія павінны ўразіць гледача ці чытача і якія павінны ўпэўніць, што нейкі чалавек альбо арганізацыя сапраўды парушылі заканадаўства Беларусі».

**Уладзімер Глод.**

ПАЛІТЫЧНЫ ЗАКЛАДНІК

# «ВЕЛЬМІ ШКАДА ЛЮДЗЕЙ, АСАБЛІВА ПЕНСІЯНЕРАЎ. ЗІМА БУДЗЕ ДЛЯ ІХ ГАЛОДНАЙ»

**Дачка палітвязня Мікалая Статкевіча атрымала ліст ад бацькі. Зьняволены палітык прызнаны цалкам працаздольным і працягвае працаваць на пілараме. Статкевіч распавёў у лісце пра жыццё ў калоніі і пра праблемы, якія яго найболей хвалююць.**

Палітвязень нармальна сябе адчувае, працуе, рыхтуецца да зімы:

– Кажуць, што зімой тут холадна, але я добра «экіпіраваны», бо Марына перадала цёплую вопратку і абутак, і зіма мяне не палохае, – піша ён у лісце да дачкі, Кацярыны Статкевіч. – Што акрамя надвор'я робіцца ў Беларусі, ты ведаеш. Па крамцы, дзе раз на тыдзень мы можам набыць тое-сёе з прадуктаў, бачна як выраслі цэны. А заробкі, асабліва ў правіцнцы, засталіся амаль без зменаў. І перспектыў паляпшэння сітуацыі я не бачу. Вельмі шкада людзей, асабліва пенсіянераў. Зіма будзе для іх галодна.

Самай вялікай праблемай у калоніі Статкевіч лічыць тых, «хто кідаецца выконваць любыя, нават самыя вар'яцкія загады свайго начальніцтва».

Апроч таго, як вынікае з ліста, зьняволеных прадпрымальнікаў, якія маюць матэрыяльныя іскі, абмяжоўваюць у краме да 35 тыс. рублеў на месяц.

– Атрымоўваецца, што катуюць людзей голадам, каб грошы заплацілі. Але ж не ўсе і маюць такія грошы, каб разлічыцца з дзяржавай, – заўважае палітвязень.

Сам Мікалай Статкевіч можа выдаваць у 5 разоў болей – 175 тысяч на месяц.

Навінаў ад Мікалая Статкевіча з калоніі не было на працягу некалькіх месяцаў. Ён прызнаўся, што не пісаў з сярэдзіны жніўня, каб пазбегнуць «публічнага чытання і калектыўных пакаранняў», тым болей што лісты не даходзілі. А зараз паспрабаваў – і праз 11 дзён адрэсат атрымаў ліст.

**Кася Вітушэвіч.**

КАМУ ШАНЦІЦЬ

# В КОЛХОЗ «ГОРОДЕЦ» ВЛОЖИЛИ ПОЧТИ 70 МЛРД РУБЛЕЙ

**Объем средств «Беларусбанка», инвестированных в ЧУП «АСБ Городец» (Шкловский район), который возглавлял Лукашенко, с 2005 года составил 67,980 млрд рублей. Об этом сообщает пресс-служба банка.**

Всего за последние 6 лет «Беларусбанк» выдал белорусским сельскохозяйственным предприятиям более 13,5 трлн рублей кредитных средств.

«Нынешний год был непростым для сельского хозяйства. Но, несмотря на трудности, работники „Городца“ достигли хороших результатов. Выращено и собрано 5615 т зерна. Урожайность зерновых и зернобобовых составила 57,4 ц/га, превысив прошлогоднюю на 5,5 ц/га. В Шкловском районе предприятие достигло лучших показателей по производству семян рапса и кукурузы на зерно», — сообщает пресс-служба банка.

Всего на развитие сельскохозяйственных предприятий, а их за «Беларусбанком» закреплено четыре, выделено средств на сумму 153,95 млрд рублей. В период с 2005 по 2011 годы в рамках Государственной программы возрождения и развития села банком предоставлено кредитов на сумму более 13,5 трлн рублей. Порядка 6,9 трлн рублей было инвестировано в обновление парка техники.

**dengi.onliner.by**

НЕ - РАСТРЭЛУ!

# "ЭТИМИ РЕБЯТАМИ ПРИКРЫВАЕТСЯ ОРГАНИЗОВАННАЯ ВОЕННАЯ СТРУКТУРА"

Правозащитник Олег Волчек высказал совместное мнение с Дмитрием Петрушкевичем и Владимиром Бородачем. Их главная оценка заключается в том, что следствие проведено неудовлетворительно и с превышением служебных полномочий следственной группы.

«Мы считаем, что этими ребятами, которых сейчас пытаются расстрелять, как Стук уже заявил, хотя суд этого еще не произнес, прикрывается организованная военная структура. О том, что есть такая законспирированная, очень высокопрофессиональная группа, которую могут рассекретить по взрыву 2008 года, заявлял Наумов. Проводя аналог между взрывами 2008 года и 2011 года, мы пришли к выводу, что это совсем разные люди совершали. Разный уровень по профессиональности. Мы рассчитываем, что все-таки суд не дойдет до этого и общественность окажет давление, чтобы не было смертного приговора», - выразил надежду Олег Волчек.

**Олег Волчек, представитель «Правовой помощи населению», которая зарегистрирована в Киеве, считает, что Коновалов и Ковалев не имели способностей, чтобы создать бомбу. Об этом он заявил на пресс-конференции в Минске 28 ноября.**

Волчек отметил, что хорошо поработали адвокаты и журналисты, проведшие мониторинг.

Как ветеран военных действий в Афганистане, Волчек считает, что, чтобы подготовить бомбу 2011 года, нужно было 4 науки пройти. Не каждый офицер в инженерно-саперной роте, где он служил, был способен сделать подобную. По его мнению, бомба 2011 года - это подготовка к серьезным действиям, поэтому правозащитник не уверен, что по Минску можно свободно гулять.

Он отметил, что не были установлены заказчики, исполнители, изготовители, а также изучены все тонкости происхождения взрывных устройств.

НАША ЖЫЦЦЁ

# ВЛАСТИ ГОТОВЯТ НОВЫЙ УДАР ПО КОШЕЛЬКАМ БЕЛОРУСОВ

БЕЛОРУССКИЕ ВЛАСТИ, ПОХОЖЕ, РЕШИЛИ НЕ ПРЕПЯТСТВОВАТЬ РОСТУ ЦЕН НА РЯД ТОВАРНЫХ ГРУПП И ТАРИФОВ НА УСЛУГИ ДО НЕОБХОДИМОГО УРОВНЯ ДО КОНЦА ЭТОГО ГОДА. К ТАКОМУ ВЫВОДУ ПРИХОДЯТ ЭКСПЕРТЫ, КОММЕНТИРУЯ ТРЕБОВАНИЕ АЛЕКСАНДРА ЛУКАШЕНКО РАЗОБРАТЬСЯ С ИНФЛЯЦИЕЙ. ЭТО ЗНАЧИТ, ЧТО БЕЛОРУСОВ В ЭТОМ ГОДУ ЖДЕТ КАК МИНИМУМ ЕЩЕ ОДИН КУРС ЦЕНОВОЙ ШОКОВОЙ ТЕРАПИИ.

***Почему президент взялся за инфляцию?***

Борьбу с инфляцией Нацбанк и рыночники из правительства обозначили как первоочередную экономическую задачу на 2012 год. Однако главу государства запланированные на следующий год шаги по ужесточению денежно-кредитной политики не устроили. Но спустя несколько дней после головомойки, устроенной рыночникам, **Лукашенко стал придерживаться их позиций.** С чего вдруг? «По всей видимости, «рыночникам» удалось убедить президента в правильности своей позиции. **Они доказали, что настаивать на сохранении прежней экономической политики опасно», — считает экономист Сергей Чалый.**

Эксперт не исключает, что решающим аргументом для президента стала встреча с главой Нацбанка Надеждой Ермаковой, которая объяснила, чем был вызван такой резкий скачок инфляции, какие угрозы для экономики исходят от дальнейшего роста цен и почему надо сдерживать эмиссионное кредитование.

«И президент, еще недавно выразивший недовольство по поводу такого низкого прогноза по росту ВВП (1,5%), заложенного рыночниками, теперь вдруг переключился на борьбу с инфляцией. И выглядит это так, как **будто не президент согласился с точкой зрения рыночников, а он сам выдвинул требование бороться прежде всего с ростом инфляции»**, — отметил Сергей Чалый.

Озвученная главой государства стратегия звучит как «прекратить шальное ценообразование». При этом требование «зачистить все в ноябре-декабре», по словам экспертов, означает, что власти согласились на дальнейшую корректировку цен на ряд товаров и услуг в сторону повышения, чтобы оставшийся «хвост» инфляции не переносить на следующий год.

«Власти хотят «собрать» в этом году всю инфляцию, которую можно, чтобы в следующем не допускать резкого роста цен и держаться в рамках 18-20%», — поясняет председатель Клуба финансовых директоров Андрей Карпунин.

Плюс импортеры ряда товарных позиций, несмотря на единый курс, продолжают закладывать в цену высокие валютные риски.

**«Да и с чего вдруг продукция будет дешеветь? — недоумевает директор одного крупного столичного универсама. — Таможенные пошлины не снизились, НДС тоже не упал».** По его словам, все это учитывается в цене товара для конечного потребителя. «На всемирной выставке вина в Дюссельдорфе немцы предлагали нам вино по 5 евро. И их откровенно шокировало, когда я сказал, что у нас такое вино будет стоить 15 евро. А все потому, что **конечная цена с учетом таможни, налогов, наценки оказывается выше начальной на 270%.** Причем, **200% забирает государство.** И когда это же государство говорит — снижайте цены, даже не знаешь, что и сказать», — отметил руководитель торгового предприятия.

СУПРАЦЬ ЧЭМПІЯНАТУ

# ГАВЕЛ, СТОПАРД І МАРЧУЛЁНІС ЗАКЛІКАЛІ ПЕРАНЕСЦІ ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ ПА ХАКЕІ З БЕЛАРУСІ

Шэраг грамадскіх дзеячоў звярнуўся ў Міжнародную федэрацыю хакея з шайбай з заклікам перанесці чэмпіянат свету па хакеі 2014 г. з Беларусі ў іншую краіну.

Сваю просьбу яны матывуюць палітычнымі рэпрэсіямі ў Беларусі і пераследам палітычных апанентаў Лукашэнкі. Яны таксама патрабуюць прыбраць хакейны швэдар з прозвішчам Лукашэнкі, перададзены беларускімі ўладамі ў Залу хакейнай славы.

Пад заявай падпісаліся былы прэзідэнт Чэхіі Вацлаў Гавел, драматург Том Стопард, славуты ў мінулым літоўскі баскетбаліст, а сёння бізнесмен Шарунас Марчулёніс, кіраўнікі Свабоднага таатра Мікалай Халезін і Наталля Каляда ды шэраг іншых дзеячоў.

**Паводле charter97.org**

ГОД ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

# БИЗНЕС НА РАСПУТЬЕ: УЕХАТЬ И РАЗВИВАТЬСЯ ИЛИ ОСТАТЬСЯ И ВЫЖИВАТЬ

По пессимистичным прогнозам экспертов, из-за кризиса в ближайший год может закрыться до 30 тысяч субъектов малого предпринимательства. Самый оптимистичный сценарий развития ситуации для бизнеса — это мелкие реформы со стороны государства и незначительное улучшение делового климата. О глобальном реформировании экономики предпринимателям придется забыть.

Несмотря на то, что до конца года еще полтора месяца, уже сейчас можно признать: Год предприимчивости откровенно провалился. Вместо масштабной либерализации и улучшения делового климата бизнес получил серию ударов в виде роста инфляции (за 10 месяцев — 88,7%), валютного кризиса и долгов.

Эксперты уже подсчитали, что в период кризисов этого года малый бизнес утратил не менее 50% оборотного капитала. Внутренний платежеспособный спрос только за январь-август 2011 года снизился в 2,5 раза. Чистый убыток за этот же период увеличился в 1,6 раза, а просроченная задолженность по кредитам и займам — в 2 раза.

Многие субъекты предпринимательства сейчас находятся в подвешенном состоянии. И не только из-за ухудшившегося финансового положения. Они не могут прогнозировать развитие бизнеса из-за неопределенности по поводу дальнейших действий государства.

«Никто не знает, что будет через три месяца, через год, какая будет инфляция, обменный курс, доступ к валюте. Если бы была принята программа по ужесточению денежно-кредитной политики, это бы дало какую-то предсказуемость. Но пока государство оттягивает принятие решения», — отмечает региональный менеджер Horizon Capital, инвестиционный банкир Владимир Василевский.

Но практика показала, что ждать милости от властей — дело неблагодарное и рискованное. Рассчитывать на что-то лучшее мешает и финансовая неустойчивость бизнеса, которая проявляется в низкой доходности, отсутствии клиентуры, сокращении рынков сбыта. Чтобы не оказаться в еще большей финансовой яме, субъекты предпринимательской деятельности активно распродают свои бизнесы.

По оценкам руководителя проекта Vashafirma.by Юрия Эбера, на 1 октября 2011 года в открытую продажу было выставлено 739 предприятий негосударственной формы собственности по заявленной стоимости 119,7 млн. долларов.

На начало года в продаже было 606 объектов на сумму 122,3 млн. долларов. Средняя стоимость предложенного бизнеса сократилась на 20%. «Но если учесть тот факт, что стоимость значительной части предприятий формировалась в докризисный период и первоначально заявленная цена вопроса не изменялась, то капитализация предлагаемых предприятий снизилась в два раза», — поясняет Юрий Эбер.

Между тем далеко не все бизнесы выставлены в открытую продажу. «Число не заявленных к публичной продаже бизнесов, по моим сведениям, равна примерно 115 млн. долларов. Серьезны ли эти цифры? В октябре 2011 года Госкомитетом по имуществу будут выставлены на продажу акции 48 ОАО на сумму 108,5 млн. долларов», — отметил эксперт.

Наихудшим вариантом для экономики в следующем году может стать продажа и отток бизнеса из страны. По мнению руководителя Центра деловых коммуникаций BEL. BIZ Татьяны Маринич, такой сценарий нельзя исключать, если кризисные явления в экономике будут нарастать.

«Из-за продолжающегося кризиса компании не смогут прогнозировать свои финансовые результаты, что приведет к оттоку бизнеса. А это означает масштабный вывоз капитала за пределы страны», — отмечает эксперт.

Вывоз капитала из Беларуси за II квартал уже превысил 300 млн. долларов. Из них 171,3 млн. долларов проходят по статье прямых инвестиций нерезидентов, а еще 129 млн. долларов — наличных и депозитов других секторов экономики.

Безусловно, уход малого бизнеса из страны скажется на жизнеспособности экономики. Ведь малый бизнес формирует почти 40% белорусского экспорта, 28,2% розничного товарооборота и дает почти 30% налоговых сборов.

Эксперты прогнозируют закрытие до 30 тысяч субъектов малого предпринимательства и появления почти 300 тысяч безработных. Страна в этом случае не дополучит как минимум 9% платежей в бюджет.

**Александр Кожемякин.**

# ДОЛЛАР-ТАКИ РВАНЁТ ПОД 20 ТЫСЯЧ?

**Александр Лукашенко признал проводившуюся экономическую политику правильной и распорядился продолжать в том же духе.**

Напомним, что 8 ноября на заседании правительства был представлен базовый прогноз на 2012 год, который предусматривал прирост ВВП 1,5%. Такие темпы не устроили Александра Лукашенко, поэтому премьер-министр Михаил Мясникович быстренько подкорректировал планы и вынес на совещание у главы государства новый проект прогноза. Ознакомившись с этим документом, Лукашенко заявил (цитируется по БЕЛТА): "Дорабатывайте эти документы. Дошлифуйте, сделайте, как надо. И исходить из 5-5,5% прироста ВВП. Премьер-министр знает мои требования – считайте. Кто не согласен и не может - пожалуйста, мы найдем другую работу."

Заказанная цифра близка озвученному правительством 7,1%. Но для этого необходимо эмиссионное кредитование госпрограмм в 2012-м на уровне 30 триллионов рублей. Печатание денег в таких объемах приведет, по мнению министерства экономики, к инфляции в размере 218% в будущем году, а обменный курс «выстрелит» на уровень 1 USD = 22000 Br.

**Кирилл Букин.**

**Заснавальнік:** Салодкі Сяргей Аляксандравіч
**Рэдактар:** Шчамлёў Аляксандр Міхайлавіч
**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы. Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742
**Падпісана да друку 28.11.2011 у 17.45.** Наклад: 290 асобнікаў.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Газета распаўсюджваецца бясплатна па адмысловай дамове рэдактара і дабраахвотнікаў.